Budzma.by

21.09.2018

# Беларуская кніжная традыцыя грунтуецца на Бібліі

Эла Дзвінская, фота аўтара

Унікальная выстаўка **“ Біблія і Беларусь”** распачала дзейнасць 20 верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і будзе дзейнічаць да 21 кастрычніка. Экспазіцыя будзе цікавай у першую чаргу тым, захапляецца гісторыяй, тэалогіяй, філалогіяй і кніжнай культурай. Яна будзе важнай для навукоўцаў і даследчыкаў, карыснай для студэнтаў-гісторыкаў і навучэнцаў нядзельных школ, апірышчам для катэзізатараў, дапамогай святарам і пастарам. На адкрыцці выставы прысутнічалі каталіцкія і праваслаўныя святары, вернікі розных канфесій, прадстаўнікі дзяржаўных структур.



Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі адзначыў, што асноўнай місіяй асветніцкай установы з’яўляецца захоўванне духоўнай спадчыны і дэманстраванне агульначалавечых каштоўнасцяў, якія перамяняюць свет да лепшага.

“Выстаўка будзе спрыяць міжканфесійнаму дыялогу”, – запэўніў Мітрапаліт Мінскі і Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч.

На ёй прадстаўлены самыя старажытныя дакументальныя помнікі сусветнага значэння – скруткі Мёртвага мора, біблейскія рукапісныя тэксты на папірусе і пергамене, гліняныя таблічкі з клінапісным тэкстам, арыгіналы Біблій Гутэнберга, Лютара і Скарыны.

"Выстаўка непаўторная тым, што ўпершыню яна дэманструе ўсю гісторыю стварэння і распаўсюджвання Бібліі. Падобная выстаўка такога фармату адбылася да гэтага ў Канконгу. І вось выбар выпаў менавіта на Беларусь, таму што наша краіна святкавала ў мінулым годдзе 500-годдзе беларускай Бібліі",- паведаміў супрацоўнік інстытута гісторыі НАН Андрусь Унучак.

Арганізатарамі выставы выступілі Нацыянальная бібліятэка Беларусі і "Група даследвання рукапісаў" (ЗША).

Археолаг і гісторык доктар Скот Кэрал і яго жонка Дэніс прыбылі са штата Мічыган (ЗША). Доктар Скот з'яўляецца дырэктарам даследчага цэнтра, вывучае старажытныя рукапісы, працуе са студэнтамі. Ён праводзіў раскопкі ў Егіпце і іншых краінах свету. Доктар Скот распавёў пра інтэрактыўны фармат дзейнасці выстаўкі. Яго мэта – кантактаваць з людзьмі і гаварыць з імі пра Біблію. Для яго сям'і гэта выстава – своеасаблівая гуманітарная місія па папулярызацыі Бібліі.

Пра кожны экспанат выстаўкі раскажуць экскурсаводы і валанцёры з беларускага боку. Восенню і зімой выстаўка будзе дэманстравацца ў Эрмітажы ў С.Пецярбургу і памяшканні Дзяржаўнай Думы ў Маскве.

"Упершыню за ўсю нашу гісторыю ў межах адной выставы ў Беларусь трапілі рарытэты сусветнай значнасці, узрост якіх дасягае 5 тысяч гадоў, -паведаміў намеснік дырэктара Нацынальнай бібліятэкі А.А. Суша. – У Беларусь яны прыбылі з Вялікабрытаніі, ЗША, Ізраіля, Карэі " На выставе можна пабачыць напісаныя 5-4 тыс. гадоў таму назад клінапісам на гліняных таблічках тэксты з Ура – радзімы Аўраама, унікальныя скруткі з Мёртвага мора ("кумранскія рукапісы"), якім больш за 2 тыс. год і якія захавалі нам самыя раннія тэксты большасці кніг Старога Запавету. Мы з радасцю паведамляем, што на Беларусь прыбылі арыгіналы Біблій Гутэнберга, Лютара і Скарыны, арыгіналы гравюр Альбрэхта Дзюрэра, Сальвадора Далі і іншых знакамітых мастакоў."



На выставе можна ўбачыць рукапісныя Торы ў скрутках часоў Ісуса Хрыста, ліст паслання святога апостала Паўла да карынцянаў на папірусе, ўнікальны рукапісны дакумент Трыдэнцкага сабора.

Частку экспазіцыі складаюць беларускія першадрукі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі.Тут можна пабачыць Слуцкае Евангелле, біблійныя крыніцы стараавераў.

“Беларуская кніжная традыцыя грунтуецца на Бібліі,- адзначыў спадар Алесь Суша.- Біблія – самая доўгажывучая і найбольш перапісваемая кніга. Таму мы збіраем яе асобнікі і знаёмім з імі наведвальнікаў.”

Беларусь атрымала дабраславенне ў больш глыбокім пазнанні гісторыі стварэння Бібліі. Адбываецца дакрананне да гуманітарных традыцый краін, у якіх Біблія прысутнічае ў культуры, прасвятляючы грамадства, служачы дэмакратызацыі, ствараючы асяродкі дабрачыннасці.

Біблія з’яўляецца самай распаўсюджанай кнігай у свеце, найчасцей перапісанай і надрукаванай. Яе сярэднегадавы продаж складае 100 мільёнаў асобнікаў і мае ўплыў на культуру, літаратуру, мастацтва.

Далікатныя джэнтльмены, ўсмешлівыя і дабразычлівыя, ахвяруючы часам і нэрвамі, затрачанымі на стасункі з беларускай мытняй, даставілі біблейскія рарытэты з розных калекцый на Беларусь. На пытанне, колькі каштуюць старажытныя манускрыпты, доктар Скот сказаў: “Яны бясцэнныя!”



У межах выставы будзе працаваць багата аніматараў з розных краін, будзе для ўсіх і кожнага друкаваць варштат часоў Гутэнберга, будзе дзейнічаць рукапісная майстэрня і агульнымі намаганнямі можна будзе напісаць агульны рукапіс, будуць працаваць заняткі “Клуба кніжных прафесараў” для дзетак, а таксама навуковы лекторый ад знакамітых

замежных і беларускіх даследчыкаў. Для чытачоў і гасцей выставы яе наведванне будзе бясплатным.

У межах дзейнасці выставы адбудзецца **лекцыя «Біблія і навука» Кенэта Брокмана ў** нядзелю, 23 верасня ў 15:00.